**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

(назва вышэйшай навучальнай установы)

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
_______________ А. В. Данільчанка
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

_____________________
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № УД-______/раб.

**Тэарэтычная граматыка беларускай мовы**
**(назва дысцыпліны)**

**Вучэбная праграма для спецыяльнасці**
**1-21 05 04 Славянская філалогія (па напрамках)**

**(код спецыяльнасці) (назва спецыяльнасці)**

Факультэт _________________філалагічны_________________________
(назва факультэта)

Кафедра __________________сучаснай беларускай мовы______________
(назва кафедры)

Курс (курсы)___ IV________________________________________________

Семестр (семестры) ______VII________________________

Лекцыі ____20_
(колькасць гадзін)

Практычныя (семінарскія) заняткі ___10__
(колькасць гадзін)

КСРС_____4
(колькасць гадзін)

Аўдыторных гадзін па вучэбнай дысцыпліне ___34___
(колькасць гадзін)

Усяго гадзін па вучэбнай дысцыпліне ___86_____
(колькасць гадзін)

Экзамен _____ VII ______
(семестр)

Залік _______-____________
(семестр)

Курсавы праект (работа) __-______
(семестр)

Форма атрымання вышэйшай адукацыі ____вочная______

Склала_____С. М. Якуба дацэнт, кандыдат педагагічных навук___________
(Ініцыялы, прозвішча, ступень, званне)

2014 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове «Теоретическая грамматика славянского языка». Типовая учебная программа для высших учебных заведений по специальности спецыяльнасці 1-21 05 04 Славянская филология. Мн., 2010.

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння на пасяджэнні кафедры
________________ сучаснай беларускай мовы __________________
(назва кафедры)

13 мая 2014 г. Пратакол № 10
(дата, нумар пратакола)

Загадчык кафедры
________________ З.І. Бадзевіч
(подпіс)

Адобрана і рэкамендавана да зацвярджэння Вучэбна-метадычнай камісіяй філалагічнага факультэта_____Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта______
(назва вышэйшай навучальнай установы)

29 мая 2014 г. Пратакол № 6
(дата, нумар пратакола)

Старшыня
________________М.М. Хмяльніцкі
(подпіс)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма дысцыпліны «Тэарэтычная граматыка славянскай мовы (беларускай)» распрацавана ў адпаведнасці з Адукацыйным стандартам Рэспублікі Беларусь і арыентавана на студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-21 05 04 «Славянская філалогія».

**Мэтай** вывучэння курса тэарэтычнай граматыкі беларускай мовы з'яўляецца паглыбленне ведаў студэнтаў па тэарэтычных, практычных і метадычных асновах беларускай мовы.

**Задачы** вывучэння дысцыпліны заключаюцца ў фарміраванні ў студэнтаў ведаў пра асаблівасці функцыянавання марфалагічнай сістэмы сучаснай беларускай мовы, неабходных для выпрацоўкі камунікатыўных навыкаў валодання мовай.

Курс тэарэтычнай граматыкі мае тэарэтыка-практычны характар і знаёміць студэнтаў са структурнымі асаблівасцямі марфалагічнай сістэмы сучаснай беларускай мовы.

У межах курса тэарэтычнай граматыкі студэнты дасканала вывучаюць беларускую мову на марфалагічным узроўні як з тэарэтыка-лінгвістычных пазіцый, прычым раздзелы дысцыпліны знаёмяць студэнтаў са спецыфічнымі асаблівасцямі марфалагічнай сістэмы беларускай мовы, так і з пункта гледжання фарміравання камунікатыўных уменняў і навыкаў.

Навучанне марфалогіі (лекцыі, практычныя заняткі, самастойная падрыхтоўка студэнтаў) ажыццяўляецца на аснове прынцыпаў навуковасці і даступнасці, пераемнасці і перспектыўнасці, сістэмнасці і паслядоўнасці, сувязі тэорыі з практыкай, актыўнасці і самастойнасці і інш. Падчас засваення моўнага матэрыялу звяртаецца ўвага не толькі на ўнутрыўзроўневыя, міжузроўневыя, але і на міжпрадметныя сувязі. Так, пры вывучэнні марфалогіі ўдасканальваюцца веды па лексіцы, фанетыцы, словаўтварэнні, сінтаксісе і іншых раздзелах курса сучаснай беларускай мовы. Асаблівая ўвага пры засваенні марфалогіі звяртаецца на развіццё арфаграфічных і пунктуацыйных навыкаў студэнтаў. Фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў па марфалогіі адбываецца ў цеснай сувязі з такімі лінгвістычнымі дысцыплінамі, як “Сучасная беларуская мова”, “Гістарычная граматыка беларускай мовы”, “Уводзіны ў мовазнаўства”, “Агульнае мовазнаўства”. Такім чынам, вывучэнне раздзела “Марфалогія” дысцыпліны “Тэарэтычная граматыка беларускай мовы” накіроўвае на засваенне мовы як суладнай сістэмы ва ўсім аб’ёме яе ўласцівасцей і функцый, што садзейнічае матывацыі навучання, стымулюе пошукавую дзейнасць па выяўленні заканамернасцей мовы і яе камунікатыўнай накіраванасці. На аснове матывацыі фарміруецца, замацоўваецца і развіваецца цікавасць студэнтаў да прадмета вывучэння, да папаўнення ўласных ведаў і самаадукацыі, павышаецца творчы патэнцыял, развіваюцца індывідуальныя здольнасці.

Акрэсліваючы ў якасці прыярытэтных метадалагічных напрамкаў пры навучанні беларускай мове развіццё моўнай і маўленчай кампетэнцый, варта адзначыць неабходнасць фарміравання пры засваенні марфалогіі лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі. Навучанне мове пры лінгвакультуралагічным падыходзе мае на мэце не толькі трывалае засваенне

лінгвістычнага матэрыялу і фарміраванне ўменне прымяняць яго на практыцы ў разнастайных маўленчых сітуацыях, але і ўсведамленне роднай мовы як нацыянальна-культурнага феномена, што передае маральны і духоўны вопыт народа. Падчас вывучэння марфалогіі фарміраванне лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі ажыццяўляецца на матэрыяле тэкстаў ярка выражанага нацыянальна-культуралагічнага зместу, а таксама шляхам лінгвакультуралагічнай аспектызацыі вучэбнага матэрыялу.

На практычных занятках выкарыстоўваюцца разнастайныя метады і прыёмы навучання: індывідуальнае, франтальнае або выбарачнае апытванне, праца з інфармацыйна-даведачнымі матэрыяламі, пісьмовая работа, выкананне тэставых заданняў (у тым ліку камп’ютарных), разнастайныя віды навучальных творчых работ, вусны і пісьмовы поўны і частковы марфалагічны разбор і інш., што стварае ўмовы для фарміравання лінгвістычнай і маўленчай кампетэнцый. Асаблівая ўвага надаецца падрыхтоўцы вусных выказванняў, якая садзейнічае ўдасканаленню ўмення самастойна працаваць з філалагічнай літаратурай (слоўнікамі, граматыкамі, энцыклапедыямі, даведнікамі, навуковай і навукова-папулярнай літаратурай, артыкуламі ў лінгвістычных выданнях і інш.), падводзіць да самастойнага асэнсавання моўных з’яў. Пошукавыя сітуацыі, што ствараюцца на занятках, накіраваны на выяўленне супярэчнасцей і заканамернасцей у марфалагічных з’явах, развіццё навуковага маўлення і інтэлекту студэнтаў.

Важнае месца ў сістэме тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі студэнтаў па раздзеле “Марфалогія” дысцыпліны “Тэарэтычная граматыка беларускай мовы” займае марфалагічны разбор. Арыентацыя на тэкстацэнтрычны падыход пры вывучэнні моўных адзінак і правядзенні лінгвістычнага разбору дазваляе студэнтам зразумець, як тая або іншая адзінка функцыянуе ў тэксце, дапамае параўнаць моўныя з’явы з іншымі, ахарактарызаваць іх паводле асноўных прымет, правесці частковы ці поўны марфалагічны разбор, выкарыстаць ва ўласным маўленні.

Шматаспектная вусная або пісьмовая характарыстыка той або іншай моўнай з’явы садзейнічае усведамленню моўнай адзінкі ў сістэме іерархічных сувязей, паглыбленню ці падагульненню ведаў па вывучанай тэме, раздзеле; фарміраванню ўмення аналізаваць, сістэматызаваць, параўноўваць, дыферэнцаваць моўныя з’явы, класіфікаваць моўныя адзінкі на аснове выяўлення спецыфічных, прыватных і агульных прымет, рабіць абгрунтаваныя вывады; развівае навуковае вуснае і пісьмовае маўленне студэнтаў, інтэлектуальныя здольнасці, выпрацоўвае ўменне карыстацца лінгвістычнай тэрміналогіяй, а таксама з’яўляецца сродкам дыягностыкі, кантролю і самакантролю ведаў, уменняў і навыкаў.

Пры вывучэнні дадзенай дысцыпліны рэкамендуюцца наступныя **метады** і **тэхналогіі** навучання:

1. Метады арганізацыі і правядзення вучэбна-пазнавальнай дзейнасці (славесныя метады; назіральныя метады; індуктыўныя і дэдуктыўныя метады; рэпрадуктыўныя і праблемна пошукавыя метады; метады самастойнай работы і работы пад кіраўніцтвам выкладчыка).

2. Метады стымулявання і матывацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці (практычныя метады, метады фарміравання пазнавальнай цікавасці).

3. Метады кантролю і самакантролю за эфектыўнасцю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, якія ўключаюць у сябе метады вуснага і пісьмовага кантролю і самакантролю.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны **ведаць**:

– асноўныя прынцыпы пабудовы і функцыянавання марфалагічнага ўзроўню сістэмы беларускай мовы;

– адносіны паміж ўзроўнямі сістэмы, удзел адзінак кожнага ўзроўню ў пабудове адзінак больш высокага ўзроўню;

– асноўныя правілы арфаэпіі, арфаграфіі і пунктуацыі, словазмянення і формаўтварэння слоў розных часцін мовы;

– сучасныя лінгвістычныя тэорыі;

**умець**:

– аналізаваць навуковую лінгвістычную літаратуру, прысвечаную асноўным праблемам беларускай мовы;

– прымяняць на практыцы асноўныя правілы арфаэпіі, арфаграфіі і пунктуацыі, словазмянення і формаўтварэння;

– супастаўляць заканамернасці пабудовы і функцыянавання ўсіх вывучаемых славянскіх моў;

– выкарыстоўваць вывучаныя тэарэтычныя палажэнні пры практычным вывучэнні славянскай мовы.

Студэнты павінны **валодаць:**

– тэарэтычнымі і эмпірычнымі метадамі збору, апрацоўкі і фіксацыі лінгвістычнай інфармацыі;

– навыкамі навукова-даследчыцкай дзейнасці;

– міждысцыплінарнымі падыходамі пры вырашэнні марфалагічных праблем;

– навыкамі аналізу марфалагічных адзінак;

– асноўнымі паняццямі марфалогіі;

– сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання, інфармацыйнымі і камп’ютарнымі тэхналогіямі ў працэсе самастойнага назапашвання ведаў па сучаснай беларускай мове.

Агульная колькасць вучэбных гадзін па дысцыпліне складае 86 гадзін, з іх 34 аўдыторныя гадзіны (20 гадзін лекцыі, 10 гадзін практычных заняткаў, 4 гадзіны КСР; форма атэстацыі экзамен).

**Асноўныя падыходы да арганізацыі самастойнай работы студэнтаў.**

Формамі арганізацыі кіруемай самастойнай работы студэнтаў з’яўляюцца:

- вывучэнне і канспектаванне хрэстаматый, зборнікаў навуковых прац, манаграфій (асобных раздзелаў);
- работа са слоўнікавай і даведачна-энцыклапедычнай літаратурай;
- складанне тэрміналагічнага слоўніка (гласарыя) па вывучаемых раздзелах ( вучэбнай тэме);
- складанне картатэкі ілюстрацыйных матэрыялаў па вучэбных тэмах (вучэбных раздзелах);
- падрыхтоўка вучэбных паведамленняў;
- выкананне кантрольных работ;
- пошукавая дзейнасць у даведачна-бібліяграфічных аддзелах бібліятэк;

- складанне бібліяграфіі па вывучаемых тэмах;
- анатаванне друкаваных і электронных крыніц (асобных глаў, раздзелаў кніг; артыкулаў, уключаючы публікацыі ў перыёдыцы);
- складанне разгорнутых планаў і тэзісаў навуковых крыніц (у тым ліку вядзенне запісаў цытатнага характару);
- рэферыраванне або канспектаванне навуковых артыкулаў, асобных раздзелаў іншых навуковых крыніц (напрыклад, манаграфій), фармуляванне іх рэзюмэ;
- напісанне аналітыка-ацэначных тэкстаў (каментарыяў, водзываў, рэцэнзій) паводле прачытаных навуковых і вучэбных крыніц;
- распрацоўка наглядных матэрыялаў па вывучаемых тэмах, уключаючы стварэнне мультымедыйных прэзентацый;
- напісанне тэматычных дакладаў, дыскусійных разважанняў на праблемныя тэмы;
- складанне тэставых заданняў па вучэбных тэмах (вучэбных раздзелаў);
- выкананне даследчыцкіх і творчых заданняў.

## Змест вучэбнага матэрыялу

### Марфалогія як раздзел тэарэтычнай граматыкі

Марфалогія, яе асноўныя паняцці. Марфалагічная спецыфіка беларускай мовы ў параўнанні з іншымі ўсходнеславянскімі мовамі. Падзел слоў на часціны мовы.

### Назоўнік

Назоўнік як часціна мовы. Семантычныя, сінтаксічныя, марфалагічныя і словаўтваральныя прыметы назоўніка. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў. Граматычныя катэгорыі назоўніка (род, лік, склон). Несупадзенне ў граматычным родзе і ліку некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах. Катэгорыя скланення назоўніка. Скланенне назоўнікаў у адзіночным і множным ліку.

### Прыметнік

Прыметнік як часціна мовы. Семантычныя, марфалагічныя і сінтаксічныя прыметы прыметніка як часціны мовы. Лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў. Ступені параўнання якасных прыметнікаў. Поўныя, кароткія і сцягнутыя формы якасных прыметнікаў. Ступені якасці (формы суб’ектыўнай ацэнкі) прыметнікаў. Словаўтварэнне прыметнікаў. Пераход прыметнікаў у назоўнікі (субстантывацыя). Скланенне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў.

### Лічэбнік

Лічэбнік як часціна мовы: асаблівасці значэння, спецыфіка граматычных катэгорый і сінтаксічных функцый. Разрады лічэбнікаў паводле значэння: колькасныя (пэўнаколькасныя (уласнаколькасныя, дробавыя і зборныя)) і няпэўнаколькасныя лічэбнікі) і парадкавыя лічэбнікі. Сінтаксічныя сувязі колькасных лічэбнікаў. Простыя, складаныя і састаўныя лічэбнікі, іх структура. Скланенне лічэбнікаў розных разрадаў.

### Займеннік

Займеннік як часціна мовы. Указальнасць як аснова займеннікаў (дэйксіс і анафара). Семантычныя, сінтаксічныя і марфалагічныя прыметы займенніка. Разрады займеннікаў па значэнні і граматычнай суаднесенасці з часцінамі мовы. Словазмяненне займеннікаў. Пераход слоў іншых часцін мовы ў займеннікі (пранаміналізацыя).

### Дзеяслоў

Дзеяслоў як часціна мовы, яго семантычныя, граматычныя прыметы і функцыі. Семантычная класіфікацыя дзеясловаў. Формы дзеяслова (спрагальныя – неспрагальныя, простыя – аналітычныя). Інфінітыў. Дзве асновы дзеяслова (аснова інфінітыва і цяперашняга часу).

Дзеясловы пераходныя і непераходныя. Зваротныя дзеясловы. Граматычныя катэгорыі дзеяслова: трыванне, стан, лад, час, асоба, лік, род.

Трыванне дзеяслова і гранічнасць. Спосабы выраэння трывальных супрацьпастаўленняў. Двухтрывальныя дзеясловы.

Формы актыву і пасіву. Праблема вызначэння стану зваротных дзеясловаў.

Катэгорыя ладу дзеяслова. Значэнне і ўтварэнне формаў умоўнага і загаднага ладу. Транспазіцыя ладоў.

Катэгорыя часу дзеяслова. Абсалютны і адносны час. Утварэнне формаў цяперашняга, будучага і прошлага часу.

Катэгорыя асобы і ліку. Безасабовыя дзеясловы.

Спражэнне дзеясловаў. Словазмяняльныя класы дзеясловаў і тыпы словазмянення асабовых дзеясловаў. Рознаспрагальныя дзеясловы.

**Дзеепрыметнік**

Дзеепрыметнік як атрыбутыўная форма дзеяслова. Утварэнне і ўжыванне дзеепрыметнікаў залежнага і незалежнага стану прошлага часу. Утварэнне дзеепрыметнікаў залежнага і незалежнага стану цяперашняга часу. Асаблівасці ўжывання ў беларускай мове. Ад’ектывацыя і субстантывацыя дзеепрыметнікаў.

**Дзеепрыслоўе**

Дзеепрыслоўе як дзеяслоўна-прыслоўная форма дзеяслова. Супрацьпастаўленне дзеепрыслоўяў паводле трывання. Утварэнне дзеепрыслоўяў закончанага і незакончанага трывання. Функцыі дзеепрыслоўяў. Асаблівасці ўжывання ў маўленні.

**Прыслоўе**

Прыслоўе як часціна мовы. Разрады прыслоўяў па значэнні і паходжанні. Асаблівасці ўтварэння ступеней параўнання прыслоўяў у беларускай мове. Словаўтварэнне прыслоўяў.

**Безасабова-прэдыкатыўныя словы**

Пытанне аб безасабова-прэдыкатыўных словах (словах катэгорыі стану) ў лінгвістычнай літаратуры. Тыпы значэнняў. Суадноснасць з іншымі часцінамі мовы.

**Прыназоўнік**

Прыназоўнік як службовая часціна мовы. Прыназоўнікі паводле паходжання і структуры. Значэнне і ўжыванне прыназоўнікаў. Марфалагічныя групы прыназоўнікаў. Сінанімія канструкцый з прыназоўнікамі. Ужыванне прыназоўнікаў з ускоснымі склонамі.

**Злучнік**

Злучнікі як службовыя словы. Значэнне і сінтаксічныя функцыі злучнікаў. Тыпы злучнікаў. Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі. Сінанімія злучнікаў.

**Часціца**

Часціца як службовая часціна мовы. Марфалагічная прырода. Тыпы значэнняў. Разрады часціц паводле іх функцыянальнага значэння. Разрады часціц паводле паходжання. Пераход у часціцы слоў іншых часцін мовы.

## Мадальныя словы

Тыпалогія значэнняў мадальных слоў. Суадноснасць мадальных слоў з рознымі часцінамі мовы, адрозненне ад знамянальных і службовых часцін мовы.

## Выклічнікі

Разрады выклічнікаў паводле значэння і паходжання. Пераход у выклічнікі слоў з іншых часцін мовы (інтэр’ектывацыя).

## Гукапераймальныя словы

Гукаперайманні, іх функцыі ў сказе і тэксце. Лексічная, марфалагічная і сінтаксічная характарыстыка гукаперайманняў.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумарраздзела, тэмы, заняткаў | Назвараздзела, тэмы, заняткаў; Пералікпытанняў для вывучэння | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныядапаможнікіiінш.) | Літаратура | Формы кантролю Ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя (семінарскія) заняткі | лабараторныя заняткі | аўдыторны кантроль КСР | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **ТЭАРЭТЫЧНАЯ ГРАМАТЫКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ: МАРФАЛОГІЯ** | **20** | **10** | | **4** | | | |
| 1.1 | **Марфалогія як раздзел тэарэтычнай граматыкі**.<br>1. Марфалогія, яе асноўныя паняцці.<br>2. Марфалагічная спецыфіка беларускай мовы ў параўнанні з іншымі ўсходнеславянскімі мовамі.<br>3. Падзел слоў на часціны мовы. | **2** | | | | Граматыкі беларускай мовы | [1 – 6] | |
| 1.2. | **Паўназначныя часціны мовы** | **16** | **10** | | **2** | | | |
| 1.2.1 | **Назоўнік**<br>1. Назоўнік як часціна мовы. Семантычныя, сінтаксічныя, марфалагічныя і словаўтваральныя прыметы назоўніка.<br>2. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў.<br>3. Граматычныя катэгорыі назоўніка (род, лік, склон). Несупадзенне ў граматычным родзе і ліку некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.<br>4. Катэгорыя скланення назоўніка. Субстантыўнае, ад’ектыўнае, змешанае і нулявое скланенні назоўніка.<br>5. Скланенне назоўнікаў у адзіночным і множным ліку. | 4 | 2 | | | Прэзентацыя ў сістэме PowerPoint<br><br>Матэрыялы электроннага падручніка | [1 – 7], [18] | камп’ютарныя тэсты |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.2.2 | **Прыметнік**<br>1. Прыметнік як часціна мовы.Семантычныя, марфалагічныя і сінтаксічныя прыметы прыметніка як часціны мовы.<br>2. Лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў.<br>3. Ступені параўнання якасных прыметнікаў.<br>4. Поўныя, кароткія і сцягнутыя формы якасных прыметнікаў.<br>5. Ступені якасці (формы суб'ектыўнай ацэнкі) прыметнікаў.<br>6. Словаўтварэнне прыметнікаў.<br>7. Пераход прыметнікаў у назоўнікі (субстантывацыя).<br>8. Скланенне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў. | 2 | 2 | | | Матэрыялы электроннага падручніка;<br><br>дапаможнік "Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні" | [1 – 7], [9], [14] | тэставыя заданні |
| 1.2.3 | **Лічэбнік**<br>1. Лічэбнік як часціна мовы: асаблівасці значэння, спецыфіка граматычных катэгорый і сінтаксічных функцый.<br>2. Разрады лічэбнікаў паводле значэння: колькасныя (пэўнаколькасныя (уласнаколькасныя, дробавыя і зборныя)) і няпэўнаколькасныя лічэбнікі) і парадкавыя лічэбнікі.<br>3. Сінтаксічныя сувязі колькасных лічэбнікаў.<br>4. Простыя, складаныя і састаўныя лічэбнікі, іх структура.<br>5. Скланенне лічэбнікаў розных разрадаў. | 2 | 2 | | | Хрэстаматыя "Беларуская мова", інфармацыйна-даведачныя матэрыялы, ВМК | [1 – 7], [11], [17] | Вуснае апытванне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.2.4. | **Займеннік**<br>1. Займеннік як часціна мовы. Указальнасць як аснова займеннікаў (дэйксіс і анафара).<br>2. Семантычныя, сінтаксічныя і марфалагічныя прыметы займенніка.<br>3. Разрады займеннікаў па значэнні і граматычнай суаднесенасці з часцінамі мовы.<br>4. Словазмяненне займеннікаў.<br>5. Пераход слоў іншых часцін мовы ў займеннікі (пранаміналізацыя). | 2 | | | 2 | Табліцы і схемы; дапаможнік “Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні” | [1 – 7], [14], [17] | КСРС |
| 1.2.5. | **Дзеяслоў**<br>1. Дзеяслоў як часціна мовы, яго семантычныя, граматычныя прыметы і функцыі. Семантычная класіфікацыя дзеясловаў.<br>2. Формы дзеяслова (спрагальныя – неспрагальныя, простыя – аналітычныя). Інфінітыў. Дзве асновы дзеяслова (аснова інфінітыва і цяперашняга часу).<br>3. Дзеясловы пераходныя і непераходныя. Зваротныя дзеясловы.<br>4. Граматычныя катэгорыі дзеяслова: трыванне, стан, лад, час, асоба, лік, род.<br>5. Трыванне дзеяслова і гранічнасць. Спосабы выраэння трывальных супрацьпастаўленняў. Двухтрывальныя дзеясловы.<br>6. Формы актыву і пасіву. Праблема вызначэння стану зваротных дзеясловаў.<br>7. Катэгорыя ладу дзеяслова. Значэнне і ўтварэнне формаў умоўнага і загаднага ладу. Транспазіцыя ладоў.<br>8. Катэгорыя часу дзеяслова. Абсалютны і адносны час. Утварэнне формаў цяперашняга, будучага і прошлага часу.<br>9. Катэгорыя асобы, ліку і роду. Безасабовыя дзеясловы. | 4 | **2** | | | Прэзентацыя ў сістэме PowerPoint ВМК<br><br>Электронны падручнік, ВМК<br><br>Інфарамацыйна-даведачныя матэрыялы | [1 – 7], [10], [13] | Вуснае апытванне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 10. Спражэнне дзеясловаў. Словазмяняльныя класы дзеясловаў і тыпы словазмянення асабовых дзеясловаў. Рознаспрагальныя дзеясловы. | | | | | | | |
| 1.2.6 | Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як асобыя формы дзеяслова<br>1. Дзеепрыметнік як атрыбутыўная форма дзеяслова. Утварэнне і ўжыванне дзеепрыметнікаў залежнага і незалежнага стану прошлага часу. Утварэнне дзеепрыметнікаў залежнага і незалежнага стану цяперашняга часу. Асаблівасці ўжывання ў беларускай мове. Ад'ектывацыя і субстантывацыя дзеепрыметнікаў.<br>2. Дзеепрыслоўе як дзеяслоўна-прыслоўная форма дзеяслова. Супрацьпастаўленне дзеепрыслоўяў паводле трывання. Утварэнне дзеепрыслоўяў закончанага і незакончанага трывання. Функцыі дзеепрыслоўяў. Асаблівасці ўжывання ў маўленні. Дзеепрыслоўе як дзеяслоўна-прыслоўная форма дзеяслова. Граматычная характарыстыка дзеепрыслоўя. Пытанне аб месцы дзеепрыслоўя у сістэме часцін мовы. Утварэнне дзеепрыслоўяў незакончанага і закончанага трывання. Ужыванне дзеепрыслоўяў у сучаснай беларускай мове. Адвербіялізацыя дзеепрыслоўяў. | 2 | 2 | | | Табліцы і схемы, ВМК | [1 – 8], [12], [15], [17],[19] | Пісьмовая работа (дыктант з граматычным заданнем) |
| 1.2.7. | Прыслоўе. Безасабова-прэдыкатыўныя словы.<br>1. Прыслоўе як часціна мовы. Прыслоўе як часціна мовы. Разрады прыслоўяў па значэнні і паходжанні. Асаблівасці ўтварэння ступеней параўнання прыслоўяў у беларускай мове. Словаўтварэнне прыслоўяў. Пераход прыслоўяў у іншыя часціны мовы.<br>2. Пытанне аб безасабова-прэдыкатыўных словах (словах катэгорыі стану) ў лінгвістычнай | 2 | | | | Матэрыялы электроннага падручніка<br><br>Зборнік тэкстаў для лінгвістычнага аналізу | [1 – 7], [15], [19] | камп'ютарныя тэсты |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | літаратуры. Тыпы значэнняў. Суадноснасць з іншымі часцінамі мовы. | | | | | | | |
| 1.3. | **Непаўназначныя часціны мовы** | **2** | | | **2** | | | |
| 1.3.1 | 1. Службовыя часціны мовы: прыназоўнік, злучнік, часціца.<br>2. Прыназоўнік як службовая часціна мовы. Прыназоўнікі паводле паходжання і структуры. Значэнне і ўжыванне прыназоўнікаў. Марфалагічныя групы прыназоўнікаў. Сінанімія канструкцый з прыназоўнікамі. Ужыванне прыназоўнікаў з ускоснымі склонамі.<br>Асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў у беларускай мове. Пераход паўназначных слоў у прыназоўнікі (прэпазіцыяналізацыя).<br>3. Злучнікі як службовыя словы. Значэнне і сінтаксічныя функцыі злучнікаў. Тыпы злучнікаў. Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі. Сінанімія злучнікаў.<br>4. Часціца як службовая часціна мовы. Марфалагічная прырода. Тыпы значэнняў.<br>Разрады часціц паводле іх функцыянальнага значэння. Разрады часціц паводле паходжання. Пераход у часціцы слоў іншых часцін мовы. | | | | | Матэрыялы электроннага падручніка, ВМК, інфармацыйна-даведачныя матэрыялы | [1 – 8], [13 – 16], [19 – 21] | Вуснае апытванне |
| 1.3. 2. | Мадальныя словы. Выклічнікі. Гукапераймanні.<br>1. Тыпалогія значэнняў мадальных слоў. Суадноснасць мадальных слоў з рознымі часцінамі мовы, адрозненне ад знамянальных і службовых часцін мовы.<br>2. Разрады выклічнікаў паводле значэння і паходжання. Пераход у выклічнікі слоў з іншых часцін мовы (інтэр’ектывацыя).<br>3. Гукапераймanні, іх функцыі ў сказе і тэксце. Лексічная, марфалагічная і сінтаксічная характарыстыка гукапераймaнняў. | | | | | Хрэстаматыя “Беларуская мова”, Кароткая граматыка беларускай мовы | [1 – 8], [13], [14] [19] | КСР |

## Інфармацыйна-метадычная частка

### Асноўная літаратура:

1. Беларуская граматыка. У 2-х ч. / Ан БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа; [Рэд. М.В.Бірыла, П.П.Шуба]. -- Мінск: Навука і тэхніка, 1985 – 1986. -- Ч.1: Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. – 1985. – С. 50 -- 210

2. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Беларуская Энцыклапедыя; пад рэд. А.Я. Міхневіча / рэдкал.: Б.І.Сачанка (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 1994. –

3. Бурак, Л.І. Сучасная беларуская літаратурная мова: вучэбны дапаможнік для студэнтаў-завочнікаў ВНУ БССР / Л.І.Бурак; пад рэд. Л.М.Шакуна. – 2-е выд. дапрац. -- Мінск, Вышэйшая школа, 1986. – С. 109-112

4. Кароткая граматыка беларускай мовы. У 2 ч. Ч. 1. Фаналогія. Марфаналогія. Марфалогія / навук. рэд. А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 351 с.

5. Сямешка, Л.І., Шкраба, І.Р., Бадзевіч, З.І. Курс беларускай мовы: падручнік / Л.І.Сямешка, І.Р.Шкраба, З.І.Бадзевіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1996. – С.

6. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія: вучэбны дапаможнік для філал. фак. ун-таў / П.П.Шуба. – Мінск: Выд-ва “Універсітэцкае”, 1987. –

### Дадатковая літаратура:

7. Беларуская мова: хрэстаматыя: вучэбны дапаможнік / аўт.-склад. З.І.Бадзевіч і інш. – Мн.: Изд-во Юнипресс, 2005. – С. 238 -- 396

8. *Бурак, Л.І., Красней, В.П., Лазоўскі, У.М.* Сучасная беларуская мова. Практычныя заняткі: дапаможнік / Л.І.Бурак, В.П. Красней, У.М. Лазоўскі. – Мінск: “Універсітэцкае”, 1989. – С. 103 -- 183

9. *Булахаў, М. Г.* Прыметнік ў беларускай мове /М.Г. Булахаў. — Мінск: Навука і тэхніка, 1964. – 200 с.

10. *Васілеўскі, М.С.* Дзеслоўнае словаўтварэнне: адыменныя суфіксальныя лексемы / М.С. Васілеўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 248 с.

11. *Вярхоў, П.В.* Лічэбнік у беларускай мове [параўнальна з рускай і ўкраінскай мовамі] / П.В. Вярхоў. -- Мінск, 1961.

12. Граматыка беларускай мовы. У 2-х ч. / Ан БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. -- Мінск: 1962, 1966. -- Ч.1: Марфалогія. -- Мінск, 1962. – 540 с.

13. *Дабрыян, М.В., Сямешка, Л.І., Шкраба, І.Р.* Сучасная беларуская мова. Лабараторныя работы / М.В. Дабрыян, Л.І. Сямешка, І. Р. Шкраба. -- Мінск: Вышэйшая школа, 1987.

14. Зборнік тэкстаў для лінгвістычнага аналізу: для студэнтаў філал. фак. / аўт.-склад.: З.І. Бадзевіч [і інш.]. – Мінск:БДУ, 2005. – 259 с.

15. *Кечык, С.Я.* Дзеепрыслоўе ў беларускай мове / С.Я.Кечык. – Мінск, 1985.

16. *Киселёв,И.А*. Частицы в современных восточнославянских языках. / *И.А Киселёв* -- Мінск, 1976. – 176 с.

17. *Лепешаў, І.Я.* Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: дапаможнік / І.Я.Лепешаў. – Гродна: ГрДУ, 2002. – С.

18. *Наркевіч, А.І.* Назоўнік: Граматычныя катэгорыі і формы /А.І. Наркевіч. -- Мінск, 1976. – 275 с.

19. Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: вучэбны дапаможнік / Н.В.Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч [і інш.]; пад агульн. рэд. праф. М.С.Яўневіча. – Мінск: Выд Ул.М. Скакун, 1997. – 286 с.

20. Сцяцко, П.У. Мовазнаўчы досвед: выбраныя творы: у 2-х ч. / П.У. Сцяцко. -- Гродна, 2005. – 240 с.

21. *Шуба, П.П.* Тлумачальны слоўнік беларускіх прыназоўнікаў / П.П. Шуба. – Мінск: Народная асвета, 1993. – 165 с.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Славянская мова | Кафедра тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства | няма | Зацвердзіць Пратакол № 10 ад 21 мая 2013 г. |

ЗМЕНЫ І ДАПАЎНЕННІ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ
на _____/_____ вучэбны год

| №№ п/п | Змены і дапаўненні | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры (пратакол № ____ ад ________ 201_ г.)

Загадчык кафедры

_________________________ __________________ _____________________
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта

_________________________ __________________ _____________________
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча)